Источник "Краязнаўчая газета" - 2014-03-20

# Алейкум Салям

***«Алейкум Салям!» – так звяртаюцца татары адно да аднаго пры сустрэчы. Так віталі яны адно аднаго і сёлета ў першы дзень каляндарнай вясны. 1 сакавіка ў Смілавічах Чэрвеньскага раёна на хаце, дзе жыў вядомы навуковец, намеснік старшыні Беларускага згуртавання татараў Ібрагім Канапацкі, была ўсталяваная мемарыяльная дошка. На ёй змешчаны надпіс: «Ібрагім Канапацкі. 1949–2005. Грамадскі і рэлігійны дзеяч беларуска-татарскага адраджэння, навуковец, гісторык». Аўтар яе – скульптар Алесь Шатэрнік, карані якога са смілавіцкіх ваколіцаў.***

Адкрыла сход дачка рупліўцы Зарына Канапацкая, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Белдзяржуніверсітэта. На ўрачыстым мерапрыемстве выступілі прадстаўнікі розных арганізацыяў і аб'яднанняў: загадчык аддзела рэдкіх кніг Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі Ірына Цітавец, аўтар і вядучая праграмы «Супольнасць» Беларускага радыё Лілія Коршун, старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Русь адзіная» Міхаіл Ткачоў, былы дырэктар Смілавіцкай сярэдняй школы № 1 Іван Ярашэвіч, настаўніца Людміла Драпеза. Выступілі і тыя, хто асабіста добра ведаў Ібрагіма Барысавіча.

**І. Ярашэвіч:**

– Ібрагім шмат ведаў, і веды свае ён удасканальваў, пашыраў на аснове дакументаў, аповедаў людзей. Ён стаяў каля вытокаў адраджэння татарскай культуры і мусульманскай веры ў Беларусі, пакінуў пасля сябе вялікую навуковую спадчыну. Няпроста было адбудаваць мячэць у Смілавічах з-за бюракратычнай цаганіны. Трэба было абысці шмат кабінетаў, напісаць нямала папераў... Ён гэта зрабіў. Сярод слаўных сыноў Чэрвеньшчыны ярка гарыць і зорка Ібрагіма Канапацкага.

**Л. Драпеза:**

– У нашым шматнацыянальным мястэчку мы праводзім розныя нацыянальныя святы і кірмашы. Сярод іх – байрам і сабантуй. Дзеці таксама перадаюць адно аднаму звычаі, традыцыі сваёй нацыі. Нядаўна прыязджалі ў Смілавічы школьнікі з Падмаскоўя, каб пазнаёміцца з татарскімі традыцыямі. Усталяванне памятнай дошкі ў гонар І. Канапацкага – знакавая падзея не толькі для Чэрвеньскага раёна, але і для ўсёй Беларусі.

**І. Цітавец:**

– Запомнілася паважлівае стаўленне Ібрагіма Барысавіча да кнігі, да рукапісаў беларускіх татараў. На яго асабістых кнігах ёсць аўтографы выдатных людзей, з якімі сябраваў: Рыгора Барадуліна, Янкі Брыля, іншых вядомых пісьменнікаў. Учора чытальная зала бібліятэкі не змагла змясціць усіх, хто прыйшоў на вечарыну, прысвечаную 65-годдзю з дня нараджэння І. Канапацкага.

**Л. Коршун:**

– Ібрагім Барысавіч быў маім сябрам, дарадцам. Мы сябравалі сем'ямі. Ад яго даведаліся, што такое мізар, хто такія татары. Самабытны татарскі этнас быў яго галоўным клопатам. Я вельмі ўдзячная Ібрагіму Барысавічу, што падтрымліваў мяне, дзяліўся ведамі, быў сапраўдным дыпламатам. Яго справу на радыё працягвала яго дачка Зарына, якая адкрыла новыя старонкі летапісу беларускіх татараў.




**М. Ткачоў** прачытаў татарскія вершы «Родны аул» і «Ластаўка», перакладзеныя ім на рускую мову. А таксама прыгадаў:

– Я вельмі цаню зробленае Канапацкім па беларуска-татарскім адраджэнні, бо яно адпавядае ісціне. Добра гэта ведаю, бо чвэрць вучняў нашага класа складалі татары, з многімі я сябраваў. У 2012 годзе паводле майго апавядання «Мая настаўніца Айша» кінастудыяй «Беларусьфільм» зняты дакументальны фільм пра смілавіцкіх татараў. У часы панавання камуністычнай ідэалогіі ў нашай краіне знішчаліся ўсе культавыя збудаванні. І ў шматнацыянальным мястэчку Смілавічы былі знішчаныя касцёл, цэрквы, мячэці, сінагогі. Шмат намаганняў давялося прыкласці вернікам-мусульманам, каб адбудаваць святыню; яна адкрылася 18 кастрычніка 1996 года. Вялікая заслуга ў гэтым належыць кандыдату гістарычных навук І. Канапацкаму. Цяпер мусульмане Беларусі маюць магчымасць сюды завітаць, каб памаліцца.

*Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ*

***P.S. Некалькі гадоў таму ў Смілавічах адзначалі 600-годдзе татараў у Беларусі. На нашыя землі яны прыйшлі з Крыма. Шмат пакаленняў татараў абаранялі ад нашэсця ворагаў беларускую зямлю, якая стала ім радзімай. Тут яны перайшлі на беларускую мову і лічаць яе сваёй. І хаця адрозніваюцца ад нас, беларусаў, найперш рэлігіяй – ісламам, але дзе можна пачуць беларускую гаворку ў Смілавічах? У Татарскай слабадзе, на правабярэжжы Волмы. І яшчэ. Менавіта дзякуючы татарам з дзвюх смілавіцкіх СШ адна і цяпер – беларускамоўная.***

Уладзімір Шулякоўскі. Алейкум Салям